## камунікаты

**Сяргей Харэўскі**
(Вільня)

# Беларускі стыль у будаўніцтве 1921-1939 гг. (Лявон Вітан Дубейкаўскі)

Беларускі нацыянальны рамантызм складаўся ва ўмовах запаволенага разьвіцьця дэмакратычнага руху, дэнацыяналізаванасьці вышэйшых клясаў і мясцовай інтэлігенцыі, іх адрывам ад традыцыйнае культуры. У літаратуры, музыцы рамантычныя тэндэнцыі даволі рана знайшлі спэцыфічна нацыянальнае ўвасабленьне ўжо ў сярэдзіне XIX ст. Але ў архітэктуры шлях да нацыянальнага самавыяўленьня быў больш складаным. Больш пасьлядоўна і красамоўней нацыянал-рамантызм увасобіўся ў шэрагу помнікаў драўлянае архітэктуры. Зварот да традыцыйнага народнага матар'ялу быў невыпадковы. Менавіта ў дрэве архітэктары, часьцяком з саліднаю практыкай капітальнага будаўніцтва, шукалі тую цяплыню й натуральнасьць, якія ўласьцівыя дрэву. Яны чарпалі натхненьне ў драўляным дойлідстве, якое мае багацейшыя народныя традыцыі. У 20-я гады была распрацаваная й вялікая тэорыя драўлянага будаўніцтва (у тым ліку і культавага). Трэба адзначыць, што ў 20-я — 30-я гады дрэва не было танным матар'ялам. У выніку першае сусьветнае вайны ўзьнік попыт на драўніну, і як наступства, дэфіцыт на яе. З-за эканоміі сродкаў некаторыя бажніцы пераносілі з аднае мясцовасьці ў іншую. А часам адмыслова некаторыя элемэнты канструкцыяў і дэкору выконваліся з дарагіх і прывезеных пародаў дрэва.

Вялікі ўплыў на фармаваньне беларускага стылю ў драўляным дойлідстве зрабілі пошукі польскіх і ўкраінскіх нацыянал-раман-

тыкаў. Стыль „закапанскі” атрымаў шырокае распаўсюджаньне ў паўднёва-ўсходняй Польшчы напрыканцы XIX і на пачатку XX ст. Ён вызначаўся актыўным пераймаеньнем народных канструктыўных і вобразных прыёмаў, іх утрываваньнем й камбінаваньнем на гэтай аснове новых тыпаў будынкаў і іх канструкцыяў. Падобныя ж тэндэнцыі набіралі сілу на Галіцыі, дзе цэнтрам прапаганды народнага дойлідства стаў факультэт архітэктуры Львоўскае палітэхнікі. Архітэктары Юліян Захарэвіч, Васіль Нагорны, а пазьней і Яўген Нагорны праектавалі дзясяткі культавых аб’ектаў ва „ўкраінскім” стылі, у тым ліку і ў паўднёвай Беларусі.

Першыя спробы сфармуляваць „беларускі” стыль у архітэктуры прыпадаюць на другое дзесяцігодзьдзе XX ст. Сьвядома працаваць у гэтым накірунку пачаў Лявон Вітан-Дубейкаўскі. Роля гэтага дойліда ў гісторыі беларускае архітэктуры выключная. Архітэктар, палітычны дзеяч, педагог, фальклярыст, паэт, ён першы абгрунтаваў і практычна ўвасобіў ідэю нацыянальнага беларускага стылю ў тагачасным будаўніцтве. Ён нарадзіўся 5 ліпеня 1867 г. ў фальварку Дубейкава, пад Мсьціславам, у клясычнай шляхецкай сям’і гэрбу „Вітан” („Відун”), якая вяла свой старажытны радавод ад літоўскіх князёў. Крыніцы свае беларускае сьведамасьці ён называў сам: маці, якая ніколі не цуралася роднае мовы і кніжачка Багушэвіча, якую паказаў яму мсьціслаўскі ксёндз. Яшчэ напрыканцы XIX стагодзьдзя, працуючы ў Смаленску, Дубейкаўскі пачаў зьбіраць беларускі фальклёр. Пісаў па-беларуску вершы, байкі, ліставаўся з беларускімі газэтамі. Па сканчэньні Мсьціслаўскае школы, бацькі адправілі яго на вучобу ў Варшаву. Варшаўская Школа будаўнічых рамёстваў стала першым крокам у архітэктуру.

Пасьля Варшавы Дубейкаўскі перабраўся бліжэй да родных мясьцінаў, у Смаленск, дзе адкрывае сваё прыватнае бюро. Сярод галоўных ягоных твораў тае пары: цэрквы ў Манастыршчыне і Ярцаве, скарбніца ў Вязьме. У 1894 г. ён перамагае ў конкурсе на будаўніцтва вялікага мураванага касьцёла ў Смаленску. На гэты ж час прыпадае „рэстаўрацыйны” пэрыяд у творчасьці маладога дойліда. Дубейкаўскі — першы беларускі архітэктар-рэстаўратар. З 1895 па 1901 г. ён праводзіць рэстаўрацыю касьцёлаў у Крычаве, Смалянах (разам з літоўскім дойлідам Янам Даўкшам), Воршы, Сьвіслачы (каля Асіповічаў) і вядома, у родным Мсьціславе. Пазьней, жывучы ў Вільні, ён кіраваў рэстаўрацыяй многіх помнікаў, у прыватнасьці, кляштараў бэрнардынаў і францішканаў, якія ацалелі дзякуючы ягонае рупнасьці.

У 1901 г. Дубейкаўскі будуе ў Смаленску, першую ў XX стагодзьдзі ў Беларусі, фабрыку жалезабэтонных вырабаў. У 1902 г. едзе

ў Пецярбург, дзе працягвае вучобу ў Інстытуце цывільных інжынераў, які сканчае ў 1903 г. з дыплёмам інжынера-архітэктара. Пасьля вяртаецца ў Смаленск, ва ўласнае бюро. Але ён прагне Парыжа. Тры гады вучобы ў францускай Акадэміі Архітэктуры (Ecole d'Architekture), дзе ён атрымаў дыплём архітэктара-мастака, дакончылі ягонае прафэсыйнае фармаваньне. Набліжалася сусьветная вайна... У 1910 г. Дубейкаўскі прабывае ў Варшаве, дзе працуе ў фірме Лільпопа й Янкоўскага і выкладае ў Тэхнічна-прамысловай школе. Бывае і ў Бэрліне. Пасьля закладае ўласнае бюро і становіцца сябрам „Koła Architektów w Warszawie". У 1915 г. ён у Арле, пасьля ў Менску, у 1916 г. у Петраградзе, ізноў у Менску, Арле, Смаленску і нарэшце, у 1918 г. — у Варшаве, дзе ачольвае Беларускі Нацыянальны Камітэт. Пры тым, паўсюль, дзе б ён ня быў, ён праектуе і будуе заводы, дамы, сядзібы. У яго не было праблемаў ні з перамяшчэньнем праз лініі фронту, ні з грашамі.

У 1916 г. у Петраградзе на замову ксяндза Будзькі ён выканаў праект касцёла ў Янатрудзе Полацкага павету ў „беларускім" стылі. Як піша сам Дубейкаўскі, заданьне было „даволі цяжкае, бо ў літаратуры ні тэхналягічнай, ні архітэктанічнай пра беларускі стыль не было ніякіх згадак". Праект быў зацьверджаны міністэрствам у студзені 1917 г., але, натуральна, застаўся нерэалізаваны. Пазьней сам Вітан-Дубейкаўскі напісаў: „Спусьця нейкага часу дачуўся, што і ксёндз Будзька ад рэвалюцыі, у цяжкіх абставінах, расстаўся з гэтым сьветам. Гэтыя сумныя падзеі, а так-жа недасконачаная сымфонія архітэктурнай паэзіі, абнялі мяне цяжкім сумам". Пра свой твор Дубейкаўскі піша ў стылі часу: „Не зусім тут мая заслуга — галоўна дапамаглі думы-думы з духу Нашага Народа". Пазьней Дубейкаўскі рэалізаваў ідэю драўлянае бажніцы ў „беларускім" стылі ў 1927-1928 гг. у в. Дрысвяты Браслаўскага р-на, выкарыстоўваючы праект 1916 г. як эскіз ідэі. У гэтым касьцёле сьв. Пятра і Паўлы Дубейкаўскі ўвасобіў цалкам свае ўяўленьні пра кампазыцыйныя і дэкаратыўныя адметнасьці беларускае архітэктуры. У першую чаргу гэта выявілася ў вельмі дынамічнай кампазыцыі і ў шырокім выкарыстаньні дрэва, як самакаштоўнага элемэнту традыцыйнае эстэтыкі. Нават бэтонныя калёны і роспісы грызайлю ў кесонах столі імітуюць разьбу па дрэве. Гэты прынцып быў абгрунтаваны Дубейкаўскім і тэарэтычна ў працы *Эволюцыя і рэформа дзераўлянага будоўніцтва*.

У кнізе *Эволюцыя і рэформа дзераўлянага будоўніцтва* Дубейкаўскі апісвае працу над гэтым праектам: „Заданьне было, хоць і прыемнае, але даволі цяжкое, бо-ж у літаратурэ — ані тэхнічнай, ані архітэктанічнай аб беларускім стылю ня было ніякага ўспаміну. Але, як трэба —то трэба! Застаўшыся без літэратурнай падмогі,

глыбока ўдумаўся ў заданьне, у ідэю нашага стылю, і запраэктаваў касьцёл. Праўда, не зусім тут мая заслуга — галоўна памаглі думы-думы з духа Нашага Народу". Гэтая кніга — першая нацыянальная тэорыя беларускага дойлідства. Дубейкаўскі бачыў адметнасьць беларускага кшталту ў дрэве, тутэйшым матар'яле: „Першабытны спосаб рубкі дзераўлянага зрубу цэніцца ў нас, на Беларусі — з прадвеку. Як і цяперыка бачым — увесь наш край: сёлы, мястэчкі, гарады разам з Вільняю аб гэтым ясна сьведчаць". Падчас праектаваньня Дубейкаўскаму давялося шукаць уласнага сыстэму драўлянага зрубу, дзеля выяўленьня якасьцяў дрэва як паўнавартаснага эстэтычна матар'ялу". Прыняўся натужна, каб сканструяваць нешта адпаведнейшае, і ўзяўся шкіцаваць — класьці на паперу ўсялякія магчымасьці, і ў рэзультаце дайшоў к памыснай разьвязцэ". Адальф Клімовіч, у *Матэрыялах да біяграфіі дзеячоў беларускай культуры і нацыянальнага руху* адцеміў: „Собскую тэхніку будаваньня з дрэва выясьніў Дубейкаўскі ў падручніку будаваньня". Новая сыстэма Дубейкаўскага была ўхваленая ў 1923 г. Таварыствам архітэктараў у Вільні. Але гэта была пакуль тэорыя. У 1924 г. Лявон Вітан-Дубейкаўскі праектуе касьцёл для мястэчка Дрысьвяты, што на Браслаўшчыне. Тым часам ён будуе царкву старавераў у Відзах, факультэт мастацтва Віленскага Унівэрсытэту (сёньня Акадэмія Мастацтваў), лясьніцтва ў Шумску, падлясьніцтва ў Кене, прыватныя дамы, уласную сядзібу ў Вільні.

Прыкладам творчасьці Дубейкаўскага можа служыць і царква старавераў у Відзах, перабудаваная ў 1910 г. (па розных зьвестках у 1905, 1912 г.). Моцна пашкоджаная падчас вайны, яна заставалася недабудаваная, і новы праект яе быў складзены ў 1922 г. Вітанам-Дубейкаўскім. Царква старавераў — простакутны ў плане будынак з пяціграннаю аўтарнаю апсыдаю і двусхільным дахам. Мяркуючы па муроўцы і па стылістычных асаблівасьцях (імітацыя драўлянага дойлідзтва) Дубейкаўскі ўзьвёў дзьве вежы, галоўны фасад аформлены трох'ярускай вежай (два чацверыкі і васмярык), завершанай невялікай гранёнай шатром-цыбулінай. Над аўтаром пастаўлены яшчэ адна вежа (васьмярык на чацьверыку). Гэткім чынам ён імітаваў прыёмы драўлянага дойлізтва ў цаглянай муроўцы.

Увесь час Дубейкаўскі не перапыняе настаўніцкую працу. У нашу гістрыю ён увайшоў і як выбітны педагог, першы беларускі выкладчык архітэктуры. Яшчэ ў 1919 г. ён выкладаў на беларускіх настаўніцкіх курсах у Горадні і ў Вільні. А ў 1925 г. стварае й кіруе Школай Будаўлянага Рамяства ў Вільні.

У 1927 г. Дубейкаўскі нарэшце прыступіў да будаўніцтва першай у сьвеце бажніцы ў беларускім стылі. На гары замчышча, якое

паўвыспаю заходзіць у Дрысьвяцкае возера, распачалася будова. Праз два гады касьцёл узьнёсься па-над дрысьвяцкімі разлогамі. „Бярэ ахвота пахваліцца монумэнтальнай будовай — дзераўляным, трохнавовым з высокай вежай касьцёлам, пабудованым — тымі-ж 16-18-летнімі вучэньнікамі, у два летніх сезоны — у 1927-ым і 1929-ым гадох у Дрысьвятах, у павеце Браслаўскім (...) сьцены агэблёваны нагладка, у злучвах, між вянцоў ні відаць ані мшэньня, ані шчэлак, столь — на закладку, а на кантах бэлек цягніцца разьба шнурочкам (...) і ўсе паасобныя фрагмэнты выпаўнены па-мастацку, а ў агульнасьці даюць сымпатычную сынтэзу, добра відаць прапорцыі асобных часьцінаў, якія ствараюць монумэнтальную форму, прыпамінаючы наш Беларускі стыль”.

Касьцёл Пятра і Паўла ўяўляе сабою прастакутную ў пляне бажніцу з пяціграннаю апсыдаю, прытворам і двума бочнымі сакрыстыямі. Страха двухсхільная, над апсыдаю і прытворам — з крыху выгнутымі вальмамі. На галоўным фасадзе высокі, шырокі навес страхі абапіраецца на чатыры тонкія жалезабэтонныя калёны і ўтварае прасторны портык з бэтонным парапэтам і шырокім лесьвічным маршам. На такія самыя тонкія калёны з жалезабэтону абапіраюцца кроквы навесаў стрэшкаў над уваходамі ў сакрыстыі. Пакрыцьцё страхі выкананае з мяккае альховае гонты і ўтварае ў ніжняе частцы характэрныя плястычныя выгібы — прыём, спэцыфічны для традыцыйнага дойлідзтва Паазер’я. Званіца цэнтральнага фасаду — шасьціярусная: два ніжнія ярусы чацьверыковыя, па-над імі — васьмярык, яшчэ вышэй два цыліндры і невялікі вэлюмападобны дэкаратыўны ліхтарык, завершаны каваным крыжам. Кожны ярус сканчаецца шырокімі гзымсамі, трохкутнымі ў сячэньні, з стрэшкамі з альховае гонты. Самі сьцены вежаў ашаляваныя вэртыкальна ў нахлёст і прарэзаныя нетыповымі для драўлянага народнага дойлідзтва Беларусі круглымі й арачнымі вокнамі. Дах над апсыдаю завершаны невялікім фігурным купалам зь ліхтарыкам, які ўзбагачае абрыс і плястыку касьцёла. Але істотней, што ён намякае на сэмантыку каталіцкае бажніцы, прысьвечанай сьвятым Пятру і Паўлу. Інтэр’ер вырашаны крайне проста і цэласна: восем круглых драўляных калёнаў падтрымліваюць кесанаваную столь, сьцены амаль нешаляваныя. У верхняй частцы прытвора разьмешчаныя вялікія хары. Агульная калярыстычная гама інтэр’еру ўтвараецца за кошт спалучэньня нефарбаванага дрэва розных пародаў (сасна, ліпа, дуб) рознае ступені апрацоўкі і манахромных арнамэнтальных роспісаў (пад дрэва) у кесонах і ў аўтары.

Ідэя нацыянальнага стылю разыходзіцца ў Дубейкаўскага з рэтраспэктывізмам і мэханічным этнаграфізмам. Разумеючы „бе-

ларускасьць" і як абсалютнае дамінаваньне дрэва (на манер нарвэскіх дойлідаў пач. XX ст.), ён, аднак, рашуча ўводзіць жалезабэтон і дэкаратыўную каменную бутоўку (невысокі цокаль і прасторная агароджа). Пры гэтым дасягаецца максымальная натуральнасьць, „умантаванасьць" у ляндшафт. Простыя і ясныя абрысы касьцёла ўтвараюць уражваючую дамінанту на высокім пагорку замчышча, пасярод паўвыспы, над возерам. Касьцёл зьліваўся з краявідам, успрымаўся як ягоная неад'емная частка. Для дасягненьня гэтае мэты Дубейкаўскі адрынуў клясычныя прыёмы архітэктуры і стварыў сваю імправізацыю на народныя тэмы беларускага дойлідзтва.

На жаль, даводзіцца канстатаваць, што падчас апошняе рэстаўрацыі ў 1993-1995 гг. касьцёла Пятра і Паўла, які знаходзіўся ў аварыйным стане доўгія гады, воблік бажніцы быў моцна скажоны. У прыватнасьці, гонтавае пакрыцьцё замененае на блішчастую бляху, сьцены ашаляваныя і пафарбаваныя, вокны зашклілі рознакаляровым шклом. Першапачатковы выгляд амаль цалкам страчаны, хоць аб'ём касьцёла па-ранейшаму дамінуе па-над ваколіцамі, актыўна фармуючы абрыс далягляду. Адсутнасьць дэкору й чужародных матар'ялаў стваралі нязвыклую, арганічную зьнітаванасьць будынка з натуральным атачэньнем.

Мысьленьне катэгорыямі арганічнае архітэктуры было для Вітана-Дубейкаўскага вынікам эвалюцыі ўсяго дойлідства і ён дакладна гэта адчуў. Дойлідства і прырода мусяць быць сплеценыя ў суцэльны гуманістычны асяродак. Ці ня першым сьведчаньнем беларускай экалягічнай думкі гучаць ягоныя словы: „Лес страшэнна эксплёатуецца і вывозіцца ў нашы гарады і за граніцу — лесу ўсё малей і ён ужо не спраўляецца з патрэбамі чалавецтва расьці". На жаль, і гэтая думка выбітнага дойліда-патрыёта патанула ў каламуці XX стагодзьдзя.

У 30-я гады Дубейкаўскі па ранейшаму шмат настаўнічае, працуе ў Беларускім Інстытуце Гаспадаркі і Культуры, аднаўляе кляштар у Друі, будуе кляштар пад Варшаваю, мікраёён на Антокалі ў Вільні. Але цяжкая хвароба прыкавала яго да ложка. Ягоная жонка, дзяячка беларускага руху, мэмуарыстка Юльяна Вітан-Дубейкаўская, у кнізе *Мае ўспаміны* піша: „Сумныя былі Каляды 1938 г. Ляля (сястра) не змагла прыйсьці, як раней прыходзіла да нас з мужам. Толькі нашыя прыяцелі — беларусы наведвалі хворага мужа. Трывожныя тады былі гутаркі. Справа Данцыга нічога добрага ня варажыла. (...) Сумна й цяжка мне было, мой добры муж амаль ужо год пасьля цяжкой апэрацыі (рак кішак), чакаў, калі Бог яго выбавіць ад ягоных мукаў. (...) 6 лістапада 1940 г. Бог адазваў яго, і ксёндз Адам Станкевіч, які ў 1922 г. нас вянчаў, яго й пахаваў на Россе

ў роднай Вільні”. І дасёньня нейкім таямнічым чынам, пад Дзяды на магіле дойліда — жывыя кветкі й сьвечы. Пад простым каменным крыжам словы са Сьвятога Пісаньня: „Ня сумуйця, як тыя, што надзеі ня маюць”.

Значны ўклад у нацыянальна-рамантычны кірунак беларускага дойлідзтва зрабіў Юліюш Клос, выбітны польскі архітэктар, прафэсар Віленскага Унівэрсытэту. Найбольш значны ягоны твор у сакральным будаўніцтве — касьцёл Маці Божае Анёльскае ў Мяжанах з 1923 г. У гэтай бажніцы, як і ў Петрапаўлаўскім касьцёле ў Дрысьвятах, вявілася квінтэсэнцыя беларускага нацыянал-рамантызму —прынцыповы зварот да традыцыйных мясцовых будаўнічых матар’ялаў і канструкцыяў, падкрэсьленая ўвага да ляндшафту, жывапісная дынамічная кампазыцыя. Некаторыя запазычэньні з „закапанскага” стылю, толькі ўбагацілі плястыку будынка (у прыватнасьці, загнутыя кроквы вальмавага даху). Аб’ёмна-прасторавая кампазыцыя гэтага драўлянага касьцёла складаецца з асноўнага аб’ёму, да якога прымкнуты прытвор, які ўвянчаны званіцаю і дзьве апсыды: прастакутныя ў пляне аўтарная, з сакрыстыяй, і пяціграннная збоку, са званіцаю. Прытвор аточаны адкрытаю галерэяй з шырокім навесам. Сцены з абчасаных бёрнаў прарэзаныя прастактутнымі й паўцыркульнымі праёмамі, падзеленыя гзымсавым пасам. Будынак пакрыты высокай страхою з выгнутымі вальмамі й плаўна перацякаючымі абрысамі. Выгіны ў ніжняй частцы страхі створаны адмыслова дадатковымі кроквамі, якія моцна выступаюць за сьцены будынка. Пакрыцьцё страхі выканана з мяккае гонты. Кампазыцыйныя дамінанты касьцёла — дзьве розныя па абрысах васьміграннныя вежы, якія завяршаюць асноўны аб’ём і званіцу. Інтэр’ер — зальнага тыпу, з плоскай падшытай стольлю.

Касьцёл Божае Маці Анёльскае ў Мяжанах вельмі блізкі па духу і канструктыўным асаблівасьцям да дрысьвяцкага касьцёла. Падкрэсьленая ўвага да месца бажніцы ў краявідзе, максімальнае выкарыстаньне натуральных якасьцяў дрэва, непасрэдная сувязь з традыцыяй і адначасова арыгінальнасьць кампазыцыі, якая выявілася ў гульні featurespознапамернымі аб’ёмамі, у прасторава разьвітых крытых галерэях, у дэцэнтралізацыі дамінант, таксама набліжаюць гэты аб’ект да касьцёла ў Дрысьвятах. Творчасьць Дубейкаўскага й Клоса запачаткавала цэлы стыль у беларускім дойлідзтве, стаўшы ўзорамі для шырокага перайманьня ўжо ў 30-я гады. Можна пералічыць некалькі прыкладаў: касьцёл у вёсцы Хаценьчыцы Вілейскага павета, 1937 г., архіт. Ян Бароўскі і архітэкт-інжынер Людвік Фаркевіч; касьцёл у Крэва, 1933 г., архіт. Пётра Стаброўскі; капліца ў в. Драздавічызна Дзісненскага павета, 1937 г., архіт.

Шакібелка; касьцёл у в. Дукшты Сьвянцянскага павета, 1933 г., архіт. Маркевіч; касьцёл сьв. Станіслава ў вёсцы Далёкія, Браслаўшчына, 1934 г., адметны сваім паўцыркульным купалам; а таксама касьцёлы ў Варапаеве, Негарэлым, Лоску, Наваельні, Дукштах.